## Роднае слова

### *Вясна ў Чаркасах пачалася надзвычай узнёсла і прыгожа – святам роднай мовы.*

***Да ўрачыстага дня ў вёсцы рыхтаваліся загадзя. З 21 лютага, сусветнага Дня роднай мовы, Дом культуры аб'вясціў у Чаркасах пачатак культурна-асветніцкай патрыятычнай праграмы "Шоу Беларушчыны". Паводле яе сярод жыхароў былі арганізаваны конкурсы на лепшае выкананне вершаў і песень на беларускай мове, створана выстава малюнкаў "Мой родны кут", а таксама адбыліся паказы папулярных мультыплікацыйных фільмаў для сямейнага прагляду, агучанных па-беларуску. Як школьнікі, так і старэйшае пакаленне вяскоўцаў актыўна прынялі ўдзел і ў напісанні традыцыйнай агульнанацыянальнай дыктоўкі, прысвечанай 120-годдзю Максіма Гарэцкага.***



# Наш скарб – наша мова



– Гэта свята – нагода для кожнага з нас задумацца пра лёс беларускай мовы, той адзінай, якую спрадвеку завём матчынай, – мяркуе адзін з галоўных арганізатараў падзеі, дырэктар Чаркаскага Дома культуры Кірыл Шык. – Усё больш моладзі размаўляе па-беларуску, і я ўпэўнены, што час, калі гэта будзе натуральнай з'явай не толькі сярод работнікаў культуры і інтэлігенцыі – недалёкі, хутка на роднай мове загамоніць само жыццё.

У першы дзень сакавіка вяскоўцы прыйшлі ў Чаркаскі Дом культуры – ўшанаваць свята; цікавіліся выставай беларускіх кніг, падрыхтаванай Чаркаскай бібліятэкай, вабіла да сябе гледачоў і выніковая экспазіцыя лепшых малюнкаў з конкурса "Мой родны кут", а таксама макеты драўляных храмаў, выкананыя мясцовым майстрам Фёдарам Асокіным.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў папярэдніх конкурсаў адкрыла святочную праграму. Як лепшая выканаўца песень на роднай мове адзначана Наталля Лічко, вершаў – сёстры Насця і Ксюша Есьман, Віка Калеснік і Віка Качанава, за ўвасабленне вобраза Бацькаўшчыны ў малюнку – Віка Варэнік. Грамату за выдатнае напісанне агульнанацыянальнай дыктоўкі атрымала Яніна Канстанцінаўна Ермаловіч. Пад шчырыя апладысменты землякоў на сцэну запрасілі таксама і жыхароў Дзяржыншчыны, якія актыўна садзейнічаюць развіццю і папулярызацыі беларускай мовы і культуры: кіраўніка фальклорнага гурта "Беларусы Мы" Чаркаскага ДК, фалькларыстку Яніну Ермаловіч, кіраўніка народнага ансамбля народнай песні "Баравічанка" Веру Ждановіч, спецыяліста па фальклору Путчынкага цэнтра культуры і адпачынку, аспірантку Акадэміі навук Беларусі Лідзію Бохан, аўтара шматлікіх песень, салістку ансамбля "Сяброўкі" Чаркаскага ДК Надзею Камарову.

Святочны канцэрт чаркаскія артысты ладзілі разам з запрошанымі калегамі. Гледачы з задавальненнем слухалі выступленні вядомага беларускага барда Тацціяны Беланогай, члена Беларускага саюза музычных дзеячоў, загадчыка музея гармонікаў, паэта-кампазітара Міхася Слізкага, народны ансамбль народнай песні "Баравічанка", ансамбль народнай песні "Сяброўкі", дзіцячы гурт "Вясёлыя ноткі".

– Правядзенне Свята роднай мовы ў Чаркасах стала агульнай справай для многіх людзей, якім ад душы хачу сказаць "дзякуй" за дапамогу ў арганізацыі, – адзначае Кірыл Шык. – Гэта ўдзельнікі рэжысёрска-пастановачнай групы: Марына Сікорская, Уладзімір Купрык, Лідзія Драчынская, Ліля Навіцкая, Аляксей Галясаў, вядучыя Вікторыя Бакуновіч і Іван Давыдзенка.

Таксама мы ўдзячныя за дапамогу ў падрыхтоўцы праграмы і падтрымку ў тэхнічным забеспячэнні мерапрыемства аддзелу культуры Дзяржынскага райвыканкама, Дзяржынскаму раённаму Цэнтру культуры і народнай творчасці, Дзяржынскаму гарадскому Дому культуры. Спадзяемся на далейшае плённае супрацоўніцтва і з МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", і з ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Мы – беларусы, наша мова – наш скарб, захаваны пакаленнямі. Трэба памятаць, што сёння мы ўмацоўваем беларускую культуру, і наша самавызначэнне ў сусветнай прасторы залежыць ад кожнага з нас.

(На здымках – святочны канцэрт).

Падрыхтавала
**Н. ТРАЦЭЎСКАЯ.**

